

УДК 903.7(476.4)

Аляксей КОЦ
Дзяніс ДУК
Яўген ТОРШЫН
Ігар МАГАЛІНСКІ
Пётр ЗЫКАЎ
Васіль МАЦВЕЕЎ

АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ *Спаса-Праабражэнскага храма ў 2015—2024 гг.*

Спаса-Праабражэнскі храм XII ст. у Полацку — помнік культавага дойлідства, які добра вядомы даследчыкам сярэдневяковай архітэктуры. Царква была ўзведзена па ўказанні ігуменні Еўфрасінні ў заснаваным ёю манастыры ў 1130—1150-я гг. Першапачаткова храм асвяціліў гонар святога Спаса, але ў 1641 г. ён быў пераасвечаны ў гонар Божага Праабражэння [12, с. 23]. У сувязі з гэтым у шэрагу публікацый мы можам сустрэць назву як Спаса-Праабражэнскі храм, так і Спаскі храм.

Ключавыя словы: *Полацк, Спаса-Праабражэнская царква, архітэктурна-археалагічныя даследаванні, раскоп, шурф, помнік архітэктуры, галерэя, пахавальны саркафаг*

Як і сама абіцель, храм перажыў складаную гісторыю. Да 1582 г. ён з'яўляўся манастырскай царквой, у якой у Сярэднявеччы былі пахаваны прадстаўнікі княжацкай дынастыі. Паўднёвая келля на хорах храма трывала звязваецца з Еўфрасінняй Полацкай, бо лічылася, што тут Прападобная здзяйсняла свой манаскі подзвіг. Такое стаўленне да келлі захавалася да нашага часу. Нават у часы, калі манастыр належаў ордэну езуітаў і царква была пераасвечана ў касцёл (канец XVI ст. — 1832 г. з перапынкам у 1654—1667 гг.), так званай келлі Прападобнай надавалася асаблівая ўвага.

Мэтанакіраваныя навуковыя даследаванні храма пачаліся з 1920-х гг. Вывучэннем кампазіцыі закамараў займаліся Н.І.Бруноў і І.М.Хозераў [1], у 1946—1947 гг. архітэктар А.А.Ашчэпкаў. Акрамя абмераў будынка даследаванні складаліся з графічнай фіксацыі фрагментаў фасадаў. Для вывучэння падмуркa былі закладзены археалагічныя шурфы [2]. Да вывучэння архітэктуры і фрэскавага жывапісу помніка звярталіся І.М.Хозераў, М.М.Шчакаціхін, М.М.Варонін і інш. Важным этапам у вывучэнні царквы Спаса сталі працы, якія адбыліся пад кіраўніцтвам П.А.Рапапорта і Р.М.Штэндэра ў 1976 г. [14]. Іх дакладныя архітэктурна-археалагічныя абмеры былі зроблены для верхняй часткі помніка. Таксама былі зладжаны невялікія шурфоўкі каля сцен храма. Публікацыя вынікаў іх даследванняў, як лічылася, падвяла вынікі вывучэнню архітэктуры будынка. Была прапанавана рэканструкцыя помніка на перыяд XII ст.

Пасля выгнання езуітаў з Расійскай Імперыі (1820 г.) нядоўгі час манастыр і храм належалі ордэну піяраў, а з 1832 г. ён пачаў адраджацца як праваслаўная святыня. За гэты час Спаса-Праабражэнскі храм неаднаразова перабудоўваўся і нават быў пад пагрозай разбурэння.

Усе рамонтныя працы да XIX ст. зараз можна засведчыць толькі па характары кладак і перабудоў. Пісьмовых звестак на сённяшні дзень не выяўлена. З пачатку XIX ст. нам вядомыя першыя замалёўкі, планы і чарцяжы царквы. Пасля 1830-х гг. адбыліся маштабныя рамонтныя работы, якім папярэднічала складанне праекта рэстаўрацыі помніка. Гэта ўсё запатрабавала абследаванняў і абмераў, якія былі ажыццёўлены А.Порта, А.Бусырскім, К.Лукіным і з'яўляліся першымі навуковымі даследаваннямі культавага аб'екта. Падобная праектная фіксацыя выконвалася і ў другой палове XIX — пачатку XX ст.

Планамерныя работы па рэстаўрацыі фрэсак Спаса-Праабражэнскага храма пачаліся ў 1990-х гг. і асабліва актыўна вядуцца з 2006 г. [15]. Яны паслужылі падставай для новых даследванняў архітэктуры храма. Падрабязныя архітэктурныя абмеры, якія ўключаюць разрэзы па розных восях з відамі на сцены будынка, спатрэбіліся для графічнай фіксацыі размяшчэння жывапісу. Гэтая праца была праведзена мастаком-рэстаўратарам У.В.Ракіцкім, які зрабіў абмеры не толькі інтэр'ера, але і ўсяго аб'ёма царквы [13]. Яго чарцяжы да гэтага часу з большага застаюцца неапублікаванымі. Але яны з'яўляюцца найбольш дакладным адлюстраваннем архітэктурных формаў старажытнага помніка.

У 2005 г. культурны пласт падцаркоўя Спаскага храма вывучаўся Д.У.Дукам [5, с. 51—59]. Галоўнай мэтай даследаванняў было выяўленне і даследаванне цагляных крыптаў. Вызначана, што яны былі пабудаваныя ў другой палове XVIII ст. Таксама зафіксавана шмат перапахаваных чалавечых парэштак з адпаведным інвентаром і асобныя некранутыя парэшткі, якія належалі прадстаўнікам ордэна езуітаў.

З пачатку 1990-х гг. царква знаходзілася ў стадыі рэстаўрацыі, якая галоўным чынам была накіравана на расчыстку і захаванне ансамбля фрэскавага жывапісу. Толькі ў 2017 г. распачаліся рэстаўрацыйныя працы на архітэктурнай частцы помніка, якія згодна з праектам прадугледжвалі ўмацаванне разбураных участкаў кладак, перакладку ці раскрыццё старажытных элементаў, замену тынкоўкі праз зняцце позніх цэментных слаёў, гідраізаляцыю ніжніх частак сцен і шмат іншага. У аснову канцэпцыі рэстаўрацыі была пакладзена ідэя захаваць вобраз храма, які быў створаны ў XIX ст., а ўнутраную прастору максімальна аднавіць да першапачатковага выгляду. У сувязі з маштабнымі рэстаўрацыйнымі працамі выконваліся археалагічныя і архітэктурныя даследаванні вакол храма, у інтэр'еры і сучасным паддашшы.

Такім чынам, археалагічнае вывучэнне Спаскай царквы да 2015 г. не мела сістэмнага характару. Першыя археалагічныя даследаванні з мэтай удакладнення праекта комплекснай рэстаўрацыі былі праведзены ў тым жа 2015 г. Па-першае, праект рэстаўрацыі не прадугледжваў захавання канструкцый XIX ст., па-другое, пасля першых археалагічных раскопак стала зразумела, што ў ім не ўлічаны архітэктурныя асаблівасці храма, якія на той час ужо былі адкрыты археолагамі. Для ўдакладнення гэтых праблемных пытанняў з 2017 па 2024 г. праводзіліся комплексныя архітэктурна-археалагічныя даследаванні ў межах праекта *"Рэканструкцыя і рэстаўрацыя Спаса-Праабражэнскай царквы ў г. Полацку (гісторыка-культурная каштоўнасць XII ст.)"*. Іх вынік кардынальна змяніў уяўленні аб першапачатковым выглядзе і прызначэнні царквы.

Археалагічныя даследаванні апошняга дзесяцігоддзя праводзіліся як на пляцоўцы вакол Спаскай царквы, так і ва ўнутранай прасторы. Галоўнай мэтай раскопак вакол храма акрамя навуковага даследавання рэштак галерэй было вызваленне ніжніх частак сцен асноўнага аб'ёма храма ад зямлі для ўладкавання гідраізаляцыі па перыметры.

Архітэктурна-археалагічная экспедыцыя была зладжана ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай сумесна з Дзяржаўным Эрмітажам (г. Санкт-Пецярбург) пры падтрымцы Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Першыя працы ў 2015 г. былі арганізаваны Д.У.Дукам. Ён прадоўжыў агульнае кіраўніцтва даледаваннямі ў 2017 г. У 2018 г. кіраўніцтва перайшло да І.У.Магалінскага, які ў наступныя гады прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі даследаванняў. А.Л.Коц з'яўляецца палявым кіраўніком усіх архітэктурна-археалагічных даследаванняў з 2015 па 2024 г.

Першыя даследаванні з боку Дзяржаўнага Эрмітажа былі ўзначалены А.М.Іаанісянам. Кіраўніком на месцы выступаў Я.М.Торшын, які з 2017 г. узначаліў экспедыцыю з расійскага боку. Таксама ў складзе калектыву актыўны ўдзел у экспедыцыі прымаў архітэктар П.Л.Зыкаў і археолаг В.М.Мацвееў.


Асноўнай працоўнай сілай выступалі студэнты ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай. Да іх далучаліся валанцёры, а ў 2019 г. і студэнты Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова. Фіксацыйнымі працамі займаліся як валанцёры, так і супрацоўнікі Дзяржаўнага Эрмітажа і Полацкага ўніверсітэта.

Методыка археалагічнага пошуку помнікаў архітэктуры адрозніваецца ад традыцыйных раскопак горада ці сельскіх паселішчаў. Археалагічныя раскопы закладваліся з мэтай максімальна атрымаць інфармацыю аб канструкцыях помніка або для раскрыцця архітэктурных элементаў для іх далейшай кансервацыі і захавання. Глыбіня раскопу вызначалася ўзроўнем архітэктурных аб'ектаў у культурным пласце або верхніх адметак падмурка. Толькі на аддаленых участках ад сцен помніка раскоп дасягаў мацерыка. Падмурак ускрываўся фрагментамі на невялікіх участках. Яго шырокае раскрыццё магло прывесці да парушэння складу камянёў, якія былі пакладзены без рошчыны.

Галоўная мэта даследаванняў заключалася ў атрыманні інфармацыі аб характарыстыках і стане старажытных кладак і іх графічнай і фотафіксацыі. Вынікі працы фіксаваліся згодна з методыкай, прынятай у архітэктурнай рэстаўрацыі. Гэта абмеры ўсіх частак пабудовы як археалагізаваных частак, так і звязаных з імі элементаў вышэй за сучасную дзённую паверхню. Чарцяжы выконваліся ў маштабах 1:10 і 1:20. На іх наносіліся абрысы архітэктурных аб'ектаў, дэталі і элементы канструкцый, характар кладкі, канструктыўныя асаблівасці будаўніцтва і інш. Для звязкі ўсіх зафіксаваных рэштак муроўкі ў адну сетку выкарыстоўваўся тахеометр.

Для раскопак і рэстаўрацыі вакол храма будаваліся навесы, пад якімі ажыццяўлялася пераборка культурнага пласта. Раскопкі праходзілі ўмоўнымі пластамі па 0,2 м, а таксама згодна са сфарміраванымі гарызонтамі. Мацерыковыя ямы, пахавальныя комплексы, будаўнічыя аб'екты і інш. разбіраліся асобна. Пераборка культурнага

У 2015 г. вакол храма было закладзена чатыры шурфы. Шурф 1 і шурф 5 раскрылі ўчасткі пры заходнім фасадзе помніка. Шурфом 3 ускрыта пляцоўка насупраць паўднёвага ўваходу. У шурфе 2 даследаваўся ўчастак пры ўсходнім фасадзе з паўночнага боку [18, с. 6]. У наступныя сезоны ўсе шурфы былі паўторна ўскрытыя. Ва ўнутранай прасторы ў 2015 г. было закладзена тры шурфы: шурф 6 (плошча 2,4 м²) — каля паўднёвай сцяны па правым боку ад уваходу, шурф 7 (плошча 2,0 м²) — каля заходняй сцяны пры цэнтральным уваходзе, шурф 8 (плошча 1,6 м²) — каля паўночнай сцяны.




Агульны выгляд археалагічнага раскопу 4 у 2019 г. (3d ракурс).

У 2017 г. былі праведзены археалагічныя раскопкі ўздоўж усяго паўднёвага фасада і пры паўднёвым участку ўсходняй сцяны Спаса-Праабражэнскага храма (раскоп 1), а таксама раскопкі ў дыяканніку царквы (шурф 9д). Раскоп 1 меў плошчу 62,21 м². Шурф 9д ахапіў пляцоўку 1,65 м².

У 2018 г. ускрываўся участак пры паўднёва-заходнім куце Спаса-Праабражэнскага храма. Ён прымыкаў да паўднёвай часткі заходняга фасада асноўнага аб'ёма і да паўднёвай сцяны сучаснага прытвора. Плошча раскопу склала 44,39 м².

Даследаванні 2019 г. працягваліся на двух участках: каля ўсходняга фасада вакол апсіды (раскоп 3) і пры паўночна-заходнім куце царквы (раскоп 4). Раскоп 3 залягаў каля паўночнага ўчастка ўсходняй сцяны і атачаў акруглую апсіду, але знешнія межы меў у прамакутнай форме. Плошча раскопу складала 22,4 м². Раскоп 4 з'яўляўся працягам раскопу 2 (2018 г.) і дазволіў раскрыць пляцоўку ўздоўж усяго заходняга фасада, вакол сучаснага прытвора і невялікі ўчастак пры заходнім прасле паўночнай сцяны. Плошча раскопу дасягнула памераў 59,3 м².

2020 г. быў складаным для правядзення археалагічных раскопак. Ад запланаванай плошчы для вывучэння паўночнай галерэі была ўскрыта толькі на 1/3 частка памерам 32,3 м². Працы вяліся ўздоўж паўночнага фасада на шырыню двух метраў ад яго. Рэшткі галерэі былі ўскрытыя часткова. У інтэр'еры ў 2020 г. было арганізавана 2 шурфы (шурфы 9 і 10) паміж парамі слупоў (падкупальныя і пад хорамі слупы), дзе згодна з канцэпцыяй рэстаўрацыі былі ўладкаваны два экспазіцыйныя ўчасткі пад шклом. Плошча кожнага шурфа дасягала 1,5 м².




Агульны выгляд археалагічнага раскопу 5 у 2020 г.

У 2021 і 2023 гг. праводзіліся невялікія археалагічныя даследаванні ў інтэр'еры Спаса-Праабражэнскага храма. У 2021 г. быў закладзены шурф (№ 11) у прасторы сучаснага прытвора на плошчы 4,2 м². У 2023 г. шурф 12 (памер 1,3×0,7 м) на плошчы 0,91 м² быў закладзены ў паўднёвым дзвярным праёме.

У 2024 г. таксама былі праведзены даследаванні на розных участках вакол Спаскай царквы. Для вывучэння старажытных канструкцый распрацоўваліся шурф 13

пласта праводзілася вельмі дэтальна для збору ўсіх знаходак, а таксама вымання ўсіх фрагментаў тынкоўкі з фрэскавым жывапісам [9].

Характар культурнага пласта вакол сучаснага аб'ёма Спаскага храма можна вызначыць як суглінак з супескам з вялікай колькасцю як будаўнічага матэрыялу, так і друзу. На асобных участках фіксуюцца толькі плямы гумусу, слаі вапнавай рошчыны і г. д. На мацерыку залягае пласта супеску, у якім вызначаюцца вугальныя плямы.



План археалагічных даследаванняў Спаса-Праабражэнскага храма.

(памер 6 м²), закладзены на месцы паўночнай сцяны паўночнай галерэі, і шурф 14 (памер 3 м²), які меў мэту вызначыць межы старажытнага прытвора, прыбудаванага з захаду. Шэраг дробных шурфоў (памерамі 1×1 м) і траншэй на пэўным аддаленні ад храма быў зроблены для ўладкавання электраасвятляльных слупоў.

Такім чынам, агульная ўскрытая плошча шляхам археалагічных раскопак на прылеглай да Спаскага храма тэрыторыі і ўнутранай прасторы склала каля 250 м². Вакол храма плошча раскопак (раскопы 1—5, шурфы 13, 14, 1э, 2э, 3э, 4э, 5э, 14э) дасягае 235,6 м². Плошча ў сучасным інтэр'еры храма (у тым ліку і ў прытворы) (шурфы 6—12, 9д) складае 14,86 м².

❖❖❖

Археалагічныя даследаванні Спаса-Праабражэнскага храма дазволілі ўпершыню вызначыць пачатковую архітэктуру помніка і прадставіць новую канцэпцыю яго захавання.

Галоўным і нечаканым вынікам даследаванняў стала адкрыццё галерэй вакол Спаса-Праабражэнскай царквы з паўночнага, паўднёвага і заходняга фасадаў, дзе размяшчаўся экзанартэкс. Пляцоўка вакол старажытнага храма даследавалася толькі з усходняга боку і пры ўсходніх праслах паўночнай і паўднёвай сцен, дзе яна была не забудавана ў старажытнасці. У астатнім жа амаль паўсюдна ўскрывалася ўнутраная прастора галерэй.

Адкрыццё галерэй вакол асноўнага аб'ёма храма паставіла перад намі шмат пытанняў. У які час былі ўзведзены галерэі — адначасова з асноўнымі сценамі царквы ці пазней? Калі яны былі разбураны? Якое было іх прызначэнне? Нарэшце, якім чынам яны прымыкалі да асноўных сцен храма і як выглядала царква ў часы іх існавання? На большасць гэтых пытанняў удалося атрымаць адказы.

Канструкцыі галерэй прымыкалі да сцен асноўнага аб'ёма без перавязкі. Яны былі складзеныя ў тэхніцы схаванага шэрагу на падмурку з валуноў без рошчыны. Паўднёвая і паўночная галерэі Спаса-Праабражэнскага храма пабудаваны карацейшымі на адно дзяленне адносна асноўнага аб'ёма царквы*. Звонку пры паўднёвым фасадзе храма (пры ўсходнім прасле) быў зафіксаваны фрагмент адмосткі XII ст., які складаўся са слою карычневага суглінку з дробнымі фрагментамі вапнавай рошчыны і ўкрапінамі гумусу. Рэшткі паўднёвай галерэі захаваліся ў моцна пашкоджаным стане. Тым не менш тут былі зафіксаваныя фрагменты папярочных сцен, участкі падлогі, пахавальныя саркафагі і аркасоліі. Некаторыя фрагменты сцен дасягалі вышыні 1 м ад узроўню падмурка (да адметкі 132,59)**.

Паўночная галерэя часткова паўтарала абрысы паўднёвай: насупраць уваходаў у асноўную прастору размяшчаліся трохчасткавыя саркафагі, усходняя частка арганізавана як асобны прыдзел з паўкруглай апсідай для размяшчэння алтара. Калі апсіда паўднёвай галерэі захавалася фрагментарна (рэшткі падмурка і фрагмент кладкі), то ў паўночнай галерэі яна цалкам разабраная, у тым ліку і камяні падмурка. Яе трасіроўка вызначана толькі па контуры рова для падмурка. У астатнім папярочныя сцены і размяшчэнне саркафагаў мелі адрозненні. У заходняй частцы паўночнай галерэі арганізавана асобнае памяшканне, дзе размяшчаліся два трохкамерныя пахавальныя саркафагі. На асобных участках зафіксаваны рэшткі падлогі паўночнай галерэі, але без чыставой паверхні. На іншым участку плінфяная вымастка пад старажытную падлогу

*Паводле першых даследаванняў выказвалася іншая думка [16].

**Тут і далей усе адметкі пададзеныя ў Балтыйскай сістэме вышыняў.

фіксуецца на ўзроўні 132,22—132,30. Рэшткі канструкцый з поўначы на асобных участках захаваліся лепш у параўнанні з паўднёвымі, але пракладка водаправоднай трубы па трасе паўночнай сцяны амаль цалкам знішчыла апошнюю. Тым не менш на адным участку быў выяўлены паўночны фасад паўночнай прыбудовы, што дазволіла вызначыць магутнасць сцяны — 0,8—0,85 м. Паўночная сцяна паўночнай галерэі зафіксаваная на той жа адлегласці ад асноўнага аб'ёма, як і паўднёвая сцяна паўднёвай галерэі: каля 4,0—4,2 м ва ўнутранай прасторы.

Пацверджана, што сучасны паўднёвы ўваход у асноўны аб'ём звязваў паўднёвую галерэю і нартэкс. Дэталі першапачатковага дзвярнога праёму былі выяўлены толькі ў паўднёвым раскопе. Мур плінфяной сцяны ніжэй за старажытны парог моцна разбураны. Адкосы цяперашняга ўваходу сфарміраваныя не раней за XVIII ст. У цэнтральным прасле паўночнай сцяны храма зафіксаваны сляды паўночнага партала (уваходу), аналагічнага паўднёваму.

Ніжнія часткі сцен экзанартэкса захаваліся значна лепш, чым рэшткі галерэй. Асобныя фрагменты кладак пачыналіся амаль адразу пад дзёрнам ці вулічнай пліткай. Яго паўднёвая і паўночная сцены з'яўляліся працягам фасадаў храма. На вуглах гэтай прыбудовы знаходзіліся лапаткі з паўкалонамі, як і на фасадах асноўнага аб'ёма. Унутры была зафіксавана падрыхтоўка пад падлогу, якая ўяўляла сабой слой выкладзеных плінф на падсыпцы дробназярністага пяску, залітых па верху слоем вапнавай рошчыны. У экзанартэксе раскапаны фрагмент саркафагу. Па завяршэнні будаўніцтва сцены экзанартэкса былі атынкаваныя і пафарбаваныя ў бэжавы колер, як і ўвесь храм. Пазней да цэнтральнага прасла заходняга фасада экзанартэкса быў прыбудаваны прытвор. У шурфе 14 (2024 г.) быў зафіксаваны фрагмент падмуркавага рова старажытнага прытвора. Гэта дазволіла рэканструяваць яго памеры ў наступных знешніх габарытах: 9,0 м па лініі захад — усход і каля 11,5 м па лініі поўнач — поўдзень.

У заходняй частцы паўднёвай галерэі, на поўдзень ад экзанартэкса, быў знойдзены падземны прыдзел, які з'яўляўся асобным камерным храмам. Гэтая канструкцыя ўнікальная і не мае аналагаў на помніках храмавай архітэктуры Русі X—XIII стст. Хутчэй за ўсё, памяшканне прызначалася для аднаго пахавання і пад яго выкарыстоўваўся аркасолій у паўночнай сцяне. Гэтае памяшканне, відаць, праектавалася як ніжні ярус заходняга завяршэння паўднёвай галерэі, але ўрэшце было зроблена будаўнікамі як асобны аб'ём. Паміж паўднёвай сцяной экзанартэкса і азначанай часткай паўднёвай галерэі не зафіксавана слядоў кладкі, што дае падставы вызначыць асобнае існаванне абодвух частак комплексу [10].

Рэштак архітэктурных канструкцый з усходняга боку пры апсідзе не зафіксавана, толькі шэраг пахаванняў позняга паходжання. Чалавечых парэштак больш ранняга часу не выяўлена. Раскопкі каля апсіды адкрылі вельмі моцна пашкоджаныя ніжнія ўчасткі сцен. Знаходкі вялікай колькасці плоскай чарапіцы дазваляюць вызначыць, што ў канцы XVI—XVII ст. апсіда храма была пакрытая плоскай дахавай чарапіцай. Рэштак хвалістай дахоўкі тут не зафіксавана.


Галерэі прызначаліся для пахаванняў людзей высокага сацыяльнага статусу. Іх хавалі ў адмысловых цагляных саркафагах. Пахавальныя камеры былі пабудаваныя з плінфы і атынкаваныя. Яны ўяўлялі сабой трохкамерныя або аднакамерныя грабніцы з памерамі аддзяленняў каля 190×55 см. У большасці выпадкаў яны былі цалкам разрабаваныя і разбураныя. Усе пахавальныя камеры былі размешчаныя ў паўночнай і паўднёвай галерэях. У экзанартэксе раскапаны толькі фрагмент аднаго саркафагу (частка ўсходняй сценкі і падлога), што пацвярджае іх існаванне і ў гэтай прасторы. У адным асобным саркафагу пры заходняй пілястры паўночнай сцяны асноўнага аб'ёма храма зафіксаваны пераадкладзеныя косткі ад пахаванняў, якія належалі прадстаўнікам высокага сацыяльнага статусу і маглі быць захаванымі ў галерэях. У адным часткова разбураным саркафагу ў паўночнай галерэі было зафіксавана некранутае жаночае пахаванне XII ст.

У паўднёвай галерэі на ўчастку другога прасла з захаду паўднёвай сцяны храма быў выяўлены пахавальны аркасолій, які быў арганізаваны шляхам часткавага разбурэння сцяны і пілястраў.

Шэраг позніх канструкцый і перабудоў быў выяўлены ў паўднёвай галерэі. Яскравымі маркерамі рамонтаў гэтага часу з'яўляюцца рознапамерная брусковая цэгла і вапнава-пясчаная рошчына. У плінфяных кладках зафіксаваны выбітыя ямы цыліндрычнай формы для ўстаноўкі драўляных слупоў. Таксама быў выяўлены цагляны мур у шурфе 2э (2024 г.) насупраць паўднёвага ўваходу ў храм, па характары кладкі ён дапасуецца да цаглянага мура папярочнай сцяны ў працяг паўднёвага фасада. Усе пералічаныя элементы з'яўляюцца слядамі рамонту або рэшткамі іншай канструкцыі езуіцкага перыяду на месцы паўднёвай галерэі. "Гнёзды" позняга паходжання для ўсталявання паніжанага даху былі зафіксаваныя на фасадах храма. Аб актыўнай гаспадарчай дзейнасці ў XVIII ст. сведчыць прапластка чорнага гумусу з арганічнымі парэшткамі (магутнасцю да 0,1—0,15 м) каля паўднёвага ўваходу ў храм. У ёй выяўленыя кафля з манаграмай ордэна езуітаў (пачатак XVIII ст.) і шэлег Яна Казіміра Вазы 1665 г. Таксама пры заходнім прасле паўднёвай сцяны храма быў знойдзены цэнтральны ўваход у падземныя крыпты XVIII ст., якія даследаваліся ў 2005 г. Ён уяўляў сабой шырокую лесвіцу з брусковай цэглы, якая моцна пашкоджана.

З паўночна-заходняга боку зафіксаваны пласт разбурэння паўночнай галерэі і экзанартэксу, які ўяўляе сабой спрасаваны слой будаўнічага смецця другой паловы XVII ст.

Сучасны заходні фасад царквы сфарміраваны ў XIX ст. з брусковай цэглы. Ён закрывае старажытную плінфяную кладку. Зандаж пад канструкцыяй (ніжэй за ўзровень дзённай паверхні) дазволіў пацвердзіць



Найбольш выбітныя археалагічныя знаходкі з раскопак пры Спаса-Праабаржэнскім храме: 1 — абразок св. Георгія, 2 — пячатка Еўфрасінні Полацкай, 3 — парадная пячатка Еўфрасінні Полацкай, 4 — пячатка Святаслава Усеваладавіча, 5 — шкляное начынне XII ст. з пахавальнага саркафага, 6 — плінфа з выявай табліцы, 7 — дэталі хорасаў, 8 — свінцовы ліст пакрыцця даху XII ст.

добра захаваны плінфяны фасад. Магутнасць цаглянай прыкладкі пасярод прасла склала не менш чым 0,5 м.

У сучасным прытворы даследаванні дазволілі засведчыць, што падлога была выкладзена з рознапамерных плітак, выкарыстаных другасна ад розных набораў XVII—XVIII стст. Падлога была зроблена ў другой палове XIX ст., калі быў узведзены прытвор. Ніжэй за іх залягалі культурныя напластаванні, сфарміраваныя будаўнічым смеццем.

Вакол храма былі выяўлены рэшткі плоскай і хвалістай дахоўкі канца XVI—XVIII ст. Яны сведчаць аб будаўніцтве двухсхільнага даху над храмам у гэты час і яго наступным рамонце з заменай пакрыцця. Пры апсідзе знойдзена яма з пабітай плоскай дахоўкай, якая выкарыстоўвалася для пакрыцця алтарнай часткі.


Шурфы ў інтэр'еры дазволілі сцвярджаць, што слупы і сцены храма былі звязаныя падмуркавымі стужкамі. Раскопкі ў дыяканніку (шурф 9д) паказалі, што да ніжніх частак мура сцен прымыкае пласт пераадкладзенага гумусу з суглінкам, пад якім залягае слой супеску. Тут быў выяўлены ўчастак падлогі XII ст., які не разбіраўся. Значны кавалак старажытнай падлогі захаваўся ў алтары. Яна мела вапнавае пакрыццё. Відавочна, што яе будаўніцтва праводзілася ў некалькі этапаў з якаснай падрыхтоўкай. Чыставы варыянт вышліфоўваўся да якаснай роўні, з максімальным падабенствам да мармуру. Старажытная падлога ў параўнанні з сучаснай знаходзілася на 0,5 м ніжэй. Даследаванні ў падземнай крыпце дазволілі зафіксаваць ніжні ўзровень каменнага падмурка на тры метры ніжэй за сучасны ўзровень дзённай паверхні. У шурфах паміж парамі слупоў выяўлены рэшткі падлогі з буйнапамерных плітак XVII ст., ніжнія часткі тынкоўкі слупоў з фрагментамі

фрэскавага роспісу, а таксама сляды падрыхтоўкі пад першапачатковую падлогу. Апроч таго, раскопкі ў інтэр'еры вызначылі знаходкі пахаванняў XVII—XVIII стст.

Археалагічныя даследаванні паказалі, што культурны пласт вакол храма моцна пашкоджаны пахаваннямі гарадскіх могілак познягa перыяду [6, с. 81]. Рэшткі сцен і падмуркаў галерэй моцна разбураныя познімі пахаваннямі. Канцэнтрацыя пахаванняў назіраецца з паўднёвага боку. З захаду і поўначы пахаванні таксама прысутнічаюць, але іх менш. Пахавальны комплекс дзейнічаў ад часу разбурэння галерэй не раней за пачатак XVIII ст. і да першай паловы XX ст. Каля апсіды за межамі храма могілкі маглі дзейнічаць з XVI ст.

На розных участках (пры заходнім фасадзе, на ўчастках уздоўж паўночнай сцяны, каля апсіды, у інтэр'еры і інш.) вакол храма зафіксаваны культурны слой, які сфарміраваўся ў працэсе будаўніцтва і існавання старажытнай драўлянай царквы, што існавала да ўзвядзення мураванай святыні. На ўзроўні дзённай паверхні XII ст. былі выяўлены сляды пажару азначанага культавага аб'екту [7, с. 331]. У раскопе каля апсіды з паўночнага боку знойдзена канцэнтрацыя фрагментаў плітак падлогі драўлянага храма. Таксама яны спарадычна сустракаюцца на ўсіх участках, дзе праводзіліся раскопкі. Дадзеныя артэфакты значна адрозніваюцца па знешніх прыкметах ад іншых плітак полацкага дойлідства і маюць ледзь падобныя аналагі ў Чарнігаве і Кіеве [11, с. 199]. Азначаныя знаходкі і сляды вугальных плямаў і прапластак сведчаць аб наяўнасці драўлянай царквы да будаўніцтва каменнага храма.

Сярод унікальных знаходак можна прыгадаць пячаткі Еўфрасінні Полацкай. Адна была выяўлена ў шурфе 3 у 2015 г. [3], а другая — у раскопе пры паўднёвай сцяне ў 2017 г. Першая была яе асабістай, а другая магла выкарыстоўвацца для афіцыйнай дыпламатычнай перапіскі з візантыйскім імператарам, канстанцінопальскім патрыярхам і іншымі статуснымі адрасатамі. Гэтая "парадная" пячатка магла быць і манастырскай [4]. У часе раскопак таксама знойдзена пячатка ўладзімірскага князя Святаслава Усеваладавіча [8], фрагменты шкляных імпартных начынняў, фрагменты абразка св. Георгія, дэталі хораса, старажытная цэгла з малюнкамі на пастэлі, свінцовы ліст дахавага пакрыцця і інш. Некаторыя знаходкі з'яўляюцца прывазнымі, што сведчыць аб шырокіх сувязях манастыра з далёкімі краінамі.



Рэканструкцыя плана архітэктурнага комплексу Спаса-Праабражэнскага храма (паводле матэрыялаў археалагічных даследаванняў). Аўтары Я.М.Торшын і П.Л.Зыкаў.

❖❖❖

Такім чынам, археалагічныя раскопкі і найноўшыя архітэктурныя даследаванні [17] дазволілі зрабіць высновы, што захаванае вонкавае аблічча царквы — гэта толькі частка больш маштабнага архітэктурнага комплексу. Царква ў XII ст. мела прыбудовы — галерэі, якія прымыкалі да асноўнага аб'ёму. Гэтыя канструкцыі былі разбураныя ў другой палове XVII — пачатку XVIII ст. Яны мелі ўнутраны фрэскавы роспіс, у асобных частках з іх размяшчаліся пахаванні XII ст.

Асобна варта адзначыць адкрыццё падземнага храма ў заходняй частцы паўднёвай галерэі. Рэстаўрацыйныя работы былі праведзены пасля археалагічных даследаванняў, і гэта дазволіла ў поўнай меры ўключыць у ахоўна-рэстаўрацыйныя мерапрыемствы захаванне адкрытых археолагамі ўсіх архітэктурных канструкцый.

Вынікі раскопак сведчаць, што ўяўленні сучаснікаў, заснаваныя толькі на вонкавым успрыняцці, могут быць істотна зменены пасля археалагічных даследаванняў. Гэтая выснова ў поўнай меры датычыцца іншых архітэктурных помнікаў полацкай школы дойлідства XII ст., большасць з якіх археалагічна дасканала не вывучалася. Нягледзячы на розную ступень іх захаванасці, праекцыя вопыту архітэктурна-археалагічнага даследавання Спаскай царквы дазваляе з высокай доляй верагоднасці прадказаць шмат археалагічных адкрыццяў у галіне полацкай архітэктурнай археалогіі.

1. Брунов, Н. И. Извлечение из предварительного отчета о командировке в Полоцк, Витебск и Смоленск в сентябре 1923 года / Н. И. Брунов. — М., 1926. — С. 3.

2. Брунов, Н. И. К вопросу о некоторых связях русской архитектуры с зодчеством южных славян / Н. И. Брунов // Архитектурное наследство. — Т. 2.

3. Дук, Д. У. Ад імя святога Спаса. Пячатка прападобнай Еўфрасінні Полацкай / Д. У. Дук, І. Л. Калечыц, А. Л. Коц // Беларускі гістарычны часопіс, 2015. — № 7. — С. 13—18.

4. Дук, Д. У. Парадная пячатка Еўфрасінні Полацкай / Д. У. Дук, І. Л. Калечыц, А. Л. Коц, Я. М. Торшын // Беларускі гістарычны часопіс, 2017. — № 9. — С. 4—8.

5. Дук, Д. У. Спадчына Еўфрасінні Полацкай: гістарычнае асэнсаванне ў святле новых адкрыццяў / Д. У. Дук. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2025. — 168 с.

6. Емельянчик, О. А. Антропологические исследования погребений при Спасо-Преображенском храме Спасо-Евфросиньевского монастыря (по материалам раскопок 2005—2018 гг.) / О. А. Емельянчик // Спасо-Преображенский храм в г. Полоцке: вопросы изучения и реставрации: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Полоцк, 17—18 сентября 2019 г. — Полоцк : Полоцкое книжное издательство, 2022. — С. 188—201.

7. Иоаннисян, О. М. Работы архитектурно-археологической экспедиции в Полоцке в 2015 году / О. М. Иоаннисян, Е. Н. Торшин, П. Л. Зыков, Д. В. Дук // Археологический сборник. 41 выпуск: материалы и исследования по археологии Евразии. — СПб. : Изд-во Гос. Эрмитажа, 2017. — С. 323—334.

8. Калбеко, Л. Г. Вислая печать Святослава Всеволодовича из раскопок у Спасо-Преображенского храма в Полоцке в 2015 г. / Л. Г. Калбеко // Спасо-Преображенский храм в г. Полоцке: вопросы изучения и реставрации: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Полоцк, 17—18 сентября 2019 г. — Полоцк : Полоцкое книжное издательство, 2022. — С. 140—142.

9. Коц, А. Л. Спецыфіка апрацоўкі археалагічных знаходак з раскопак на помніках архітэктуры старажытнарускага перыяду / А. Л. Коц // Охрана и популяризация культурного наследия: мировой и отечественный опыт : материалы междунар. науч.-практической конф., Витебск, 22—23 октября 2021 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол. : А. Н. Дулов (отв. ред.) [и др.]. — Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2021. — С. 91—97.

10. Магалинский, И. В. Предварительные результаты археолого-архитектурных исследований на территории Спасо-Преображенского храма Спасо-Евфросиньевского монастыря в городе Полоцке в 2018 г. / И. В. Магалинский, А. Л. Коц, Е. Н. Торшин, П. Л. Зыков // Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов : сб. науч. работ Междунар. науч.-практ. конф. к 50-летию Полоц. гос. ун-та, Новополоцк, 18—19 окт. 2018 г. / Полоц. гос. ун-т; под общ. ред. В. Е. Овсейчика (отв. ред.), Г. И. Захаркиной, Р. М. Платоновой. — Новополоцк : Полоц. гос. ун-т, 2018. — С. 45—50.

11. Матвеев, В. Н. Древнерусские керамические плитки из раскопок вокруг Спасского собора Евфросиниевского монастыря в Полоцке (по материалам работ 2017—2019 гг.) / В. Н. Матвеев, Е. Н. Торшин, А. Л. Коц // Спасо-Преображенский храм в г. Полоцке: вопросы изучения и реставрации: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Полоцк, 17—18 сентября 2019 г. — Полоцк : Полоцкое книжное издательство, 2022. — С. 188—201.

12. Полоцкий Спасо-Евфросиньевский женский монастырь с древности до наших дней : путеводитель — Полоцк: Спасо-Евфросиньевский ставропигиальный женский монастырь, 2023. — 176 с.

13. Ракицкий, В. В. Мера, мерки и обмеры Спасской церкви XII века в Полоцке // История и археология Полоцка и Полоцкой земли : материалы VI междунар. конф. (1—3 ноября 2012 г.). Часть II. Спасо-Преображенская церковь в Полоцке. — Полоцк, 2013. — С. 36—47.

14. Раппопорт П. А. Спасская церковь Евфросиньева монастыря / П. А. Раппопорт, Г. М. Штендер // Памятники культуры. Новые открытия. 1979. — Л., 1980. — С. 459—468.

15. Сарабьянов, В. Д. Спасо-Преображенская церковь Евфросиньева монастыря в Полоцке / В. Д. Сарабьянов. — М., 2009. — С. 26.

16. Торшин, Е. Н. Галерея Спасо-Преображенской церкви Евфросиньева монастыря в Полоцке (предварительные итоги архитектурно-археологических исследований) / Е. Н. Торшин, Д. В. Дук, О. М. Иоаннисян, П. Л. Зыков, А. Л. Коц // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. III міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 14—15 крас. 2016 г. : у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, А. І. Корсак. — Наваполацк, 2016. — Ч. 1. — С. 22—40.

17. Торшын, Я. М. Барабан Спаса-Праабражэнскага храма ў Полацку (па матэрыялах новых даследаванняў 2021 года) / Я. М. Торшын, П. Л. Зыкаў, А. Л. Коц // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. — 2024. — № 3. — С. 18—26.

18. Торшын, Я. М. Спасціжэнне першапачатковай задумы архітэктуры Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: па выніках даследаванняў 2015 года / Я. М. Торшын, Д. У. Дук, А. Л. Коц, А. М. Іаанісян, П. Л. Зыкаў // Беларускі гістарычны часопіс, 2016. — № 7. — С. 5—16.

Паступіў у рэдакцыю 11.07.2025.